паэзія

## Сяргей Чыгрын



...Седзячы высока
На возе,
Бацька бачыць
За Шчараю —
Восень...

# Крочу ў восень...

### ПАЭТ

*Паэт — гэта той, хто піша вершы,*
*І той, хто вершаў ня піша.*
Тадэвуш Ружэвіч

Паэт — гэта той, хто сяброў сустракае,
І той, хто ня мае ніякіх сяброў.
Паэт — гэта той, хто дамоў прыязджае,
І той, хто ня можа прыехаць дамоў.
Паэт — гэта той, хто жанчыну кахае,
І той, хто ня ўмее жанчыну кахаць.
Паэт — гэта той, хто заўжды памірае,
І той, хто ня можа ніколі сканаць.
Паэт — гэта той, хто крадзе і махлюе,
І той, хто нічога ніколі ня краў.
Паэт — гэта той, хто заўсёды ваюе,
І той, хто мяча у руках не трымаў.

Паэт — гэта той, хто сабой ганарыцца,
І той, хто трывае пагарду людзей.
Паэт — гэта той, хто вайны не баіцца,
І той, хто на бітву са страхам ідзе.
Паэт — гэта той, хто віно выпівае,
І той, хто ня можа выпіць да дна.
Паэт — гэта той, хто вясну сустракае,
І той, каму толькі сьніцца вясна.
Паэт — гэта той, каго ўсе ненавідзяць,
І той, каго любяць, як Бога, усе.
Паэт — гэта той, каго нельга
пакрыўдзіць,
І той, хто ўсе крыўды ў сабе нясе.
Паэт — гэта той, хто заўжды чакае,
Што разгадае жыцьця сакрэт...
Паэт — гэта той, хто Радзіму кахае!..
Паэт — гэта той, хто — паэт!

* * *

Паеду ў вёску
Дадому —
Там
Пачалося жніво,
І возяць салому.
Седзячы высока
На возе,
Бацька бачыць
За Шчараю —
Восень.

**Шчара**

Бессаромная Шчара
Зарасла
Чаротам і асакою.
Шчырая Шчара
Працякае праз Слонім
І праз
Маё сэрца.

*   *   *

Крочу ў восень
Ціха, асьцярожна.
Вецер лісьце
Жоўтае скубе.
Скача дождж
Па голай, колкай пожні,
Як па прызьбе
Шэры верабей.

**КАМЕНЬ**

Паеду ў Наваградак,
Каб спатыкнуцца
Аб камень Міндоўга,
Аб які спатыкаўся
Адам Міцкевіч.